Источник: **«Наша слова»** **2013-07-04**

## Цікавая вечарына

20 чэрвеня 2013 года ў інфармацыйна-навуковай бібліятэцы імя Я. Коласа НАН Беларусі адбылася вечарына "І зноў была нядзеля, як тады, у сорак першым...", прысвечаная 72-й гадавіне з дня пачатку Вялікай Айчыннай вайны і 10-й гадавіне з дня смерці народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава. Арганізатарамі мерапрыемства выступілі Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Я. Коласа НАН Беларусі і Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры.

Да імпэзы аддзелам рэдкіх кніг і рукапісаў бібліятэкі падрыхтавана выстава "Пайсці і вярнуцца", на якой прадстаўлены творы Васіля Быкава, прысвечаныя Вялікай Айчыннай вайне. Тэма вайны стала галоўнай ў пісьменніцкім лёсе аўтара. Ён паказаў вайну так, як ніхто, - шчыра і праўдзіва, бо лічыў, што *"толькі праўдзівыя і толькі да канца асэнсаваныя сведчанні мінулай вайны могуць саслужыць чалавецтву патрэбную службу"*. Сваімі творамі Васіль Быкаў папярэджвае нас і наступныя пакаленні аб недапушчальнасці новай вайны, якая можа стаць апошняй для чалавецтва.

Асобны раздзел экспазіцыі прадстаўляе публікацыі пра жыццё і дзейнасць народнага пісьменніка Беларусі.

Экспануюцца дакументы з асабістага архіву вядомага беларускага пісьменніка Уладзіміра Караткевіча, якога звязвалі з Васілём Быкавым сяброўскія адносіны, сярод іх фотаздымкі, лісты, шарж Васіля Быкава на Уладзіміра Караткевіча.

На выставе можна пабачыць кнігі з аўтографамі Васіля Быкава, у тым ліку падараваныя аўтарам аддзелу рэдкіх кніг і рукапісаў акадэмічнай бібліятэкі.

На мерапрыемстве выступалі: Лідзія Шагойга, літаратуразнаўца Галіна Крэчка, пісьменнікі Анатоль Вярцінскі. Міхась Тычына, генерал-маёр Анатоль Сульянаў.

Артыст купалаўскага тэатра Андрэй Кавальчук чытаў творы Васіля Быкава. На мерапрыемстве прысутнічала творчае інтэлігенцыя г. Менска. Было цікава.

***Аляксей Шалахоўскі,*** *гісторык, журналіст.*